# БЕЛАРУСЬ ЗАБЯСПЕЧЫЛА САБЕ ВЫБАРЧЫ СУВЕРЭНІТЭТ



## АБ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ З КІТАЕМ: «МЫ ПАСПЯХОВА ЗАХАД ЗАМЯНЯЕМ НА УСХОД»

У Аляксандра Лукашэнкі спыталі, якім ён бачыць далейшае развіццё беларуска-кітайскіх адносін. Прагноз выключна аптымістычны. Беларускі лідар звярнуў увагу, што супрацоўнічаць Беларусь і Кітай будуць ціха, спакойна, бо хапае ашалелых, гатовых уставіць палкі ў калёсы. «Мы дамовіліся з кітайцамі, што не будзем апублічваць, занадта дэталізаваць наша супрацоўніцтва. Але сёння тое, што мы некалі планавалі і пачыналі рабіць з заходнімі кампаніямі, мы паспяхова скончылі і працуем з кітайцамі. У Кітаі для развіцця нашай эканомікі ёсць усё», — адзначыў ён. І, што важна, звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка, кітайцы, у адрозненне ад заходніх контрагентаў, не хаваюць свае тэхналогіі і гатовы дзяліцца імі.

«Мы паспяхова Захад замяняем на Усход за кошт Расіі і Кітайскай Народнай Рэспублікі ў асноўным. Ёсць і іншыя краіны. У гэтым сутнасць нашага супрацоўніцтва», — сказаў Прэзідэнт.

«Вось наша будучыня: мы для вас гатовы зрабіць усё, што вам трэба ў Еўропе, а вы для нас зробіце ўсё для таго, каб наша краіна засталася высокатэхналагічнай і мы маглі замяніць заходніх прадстаўнікоў, якія ўцяклі ад нас. Не канкрэтызуючы, не дэталізуючы. Шмат кітайцы нам дапамаглі, думаю, што і дапамагаць будуць», — рэзюмаваў Прэзідэнт, звяртаючыся праз кітайскага журналіста да кітайскай аўдыторыі.

## АБ САЮЗНАЙ БЯСПЕЦЫ: «ПАРАСОН ПАТРЭБЕН, КАБ ДАЖДЖУ ЎВОГУЛЕ НЕ БЫЛО»

Вялікі пул журналістаў з Расіі акрэдытаваны для работы на выбарах. Таму пытанні саюзнага парадку дня актыўна гучалі на прэс-канферэнцыі Прэзідэнта. Аляксандр Лукашэнка нават прызнаўся, што ў выпадку сваёй перамогі на выбарах найперш здзейсніць візіт у Расійскую Федэрацыю, дзе праўдзе перагаворы са сваім расійскім калегам Уладзімірам Пуціным. Па яго словах, было б дзіўна, калі б першым пунктам была не Масква, тым больш што абмеркаваць ёсць шмат чаго.

Журналісты таксама згадалі цытату сакратара Савета бяспекі Расійскай Федэрацыі Сяргея Шайгу аб тым, што расійскі «ядзерны парасон» забяспечвае абарону Рэспублікі Беларусь у тых жа рамачных сцэнарыях, у якіх Расія дапускае ядзернае рэагаванне для ўласнай абароны. Аляксандр Лукашэнка чарговы раз падкрэсліў, што ядзерная зброя ў Беларусі служыць найперш для стрымлівання. «Гэты «ядзерны парасон» патрэбен не для таго, каб не прамокнуць пад ядзерным «дажджом», а каб гэтага «дажджу» ўвогуле не было», — вобразна растлумачыў ён.

У працяг тэмы абароны закранулі і пытанне размяшчэння на беларускай тэрыторыі «Арэшніка». Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што рашэнне размясціць у Беларусі гэты комплекс — гэта адказ на жаданне і магчымасць размяшчэння амерыканскіх ракет сярэдняй далёкасці ў Еўропе. Журналісты спыталі, дзе дакладна будзе размешчаны «Арэшнік». «Туды, бліжэй да Смаленска. Я так мару. А там паглядзім», — адказаў кіраўнік дзяржавы. Спыталі і пра тэрміны пастаўкі. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, яны з Уладзімірам Пуціным пакуль тэрміны не вызначалі. «Не гарыць», — заўважыў беларускі лідар.

## АБ УПЛЫВЕ ТРАМПА: «ЁН МОЖА ПАСТУПІЦЬ АЛАГІЧНА»

На прэс-канферэнцыі Прэзідэнта Беларусі журналісты (найперш заходнія) нямала ўвагі ўдзялілі і іншаму прэзідэнту — выбранаму нядаўна Прэзідэнту ЗША Дональду Трампу.

«Дональд — класны артыст, акцёр. Ён шоўмен, бізнесмен і іншае. Вельмі класны. Ён умее гэта рабіць. Мы таксама гэта ўмеем рабіць. Але ў яго характар такі, што ён не саромеецца гэта рабіць. Як вопытны палітык, павінен сказаць, што я не зусім разумею і не ведаю, што зменіцца ў нас у нашым рэгіёне пасля прыходу да ўлады Трампа», — адказаў Аляксандр Лукашэнка на пытанне аб тым, якіх геапалітычных змяненняў ён чакае пасля прыходу Трампа да ўлады.

Разам з тым не выключана, што Дональд Трамп можа паўплываць на вырашэнне канфлікту ва Украіне. І тут, па словах беларускага лідара, варта спадзявацца на «алагічнае рашэнне» амерыканскага прэзідэнта, на якое ён здольны ў параўнанні з традыцыйнай палітыкай ЗША. «Калі зыходзіць з логікі і карыстацца ўкаранелымі крытэрыямі вырашэння такіх пытанняў, амерыканцы ніколі не пойдуць на тое, каб задаволіць патрабаванні і спадзяванні расійскага народа і Прэзідэнта. Гэта не ў іх інтарэсах. Але Трамп непрадказальны. Ён у гэтым плане можа «бабахнуць» і пайсці на тое, што ён паабяцаў, — мір. Гасподзь яго вуха прастрэліў, а не галаву, у тым ліку і для таго, каб ён гэты мір устанавіў. І ён верыць гэтаму ўнутры. Ён вельмі ўстойлівы. Яго памочнікам і іншым цяжка паварушыць і кудысьці яго павярнуць. Значыць, ён можа паступіць алагічна — не так, як нам цяпер здаецца. І мы на гэта спадзяёмся», — падзяліўся Аляксандр Лукашэнка. Таму, на яго думку, дасягненне міру магчыма. «Але ў мяне 50/50. Думаю, амерыканцы будуць рабіць так, каб нам і Расіі было не вельмі добра», — дадаў беларускі лідар.



## АБ МІРЫ ВА УКРАІНЕ: «У ГЭТЫМ ГОДЗЕ РАЗВЯЗКА НЕЙКАЯ БУДЗЕ»

Тэма міру ва Украіне падчас прэс-канферэнцыі гучала вельмі актыўна. Журналісты цікавіліся меркаваннем Аляксандра Лукашэнкі на гэты конт, пыталіся, калі мір можа быць дасягнуты і што для гэтага трэба зрабіць.

> **«У гэтым годзе развязка нейкая будзе. Я не гавару, што скончыцца вайна і іншае. Канфліктаваць, напэўна, яшчэ доўга будуць, але развязка будзе. Святло ў канцы тунэля з'явіцца ў гэтым годзе», — заявіў Прэзідэнт.**

Ён неаднаразова падкрэсліваў, што беларускі бок выступае за мір ва Украіне. Але, па словах Аляксандра Лукашэнкі, сёння трэба ўлічваць усё, і пазіцыю Расіі: без яе нікуды. «Ніякая Амерыка ніколі Расію не прымусіць. Трамп не ідыёт, не дурань, ён так Пуціну не скажа. А калі скажа, гэта будзе на шкоду. Нельга панукваць і намі круціць. У нас ёсць свае інтарэсы, а ў Расіі тым больш. Але мы не хочам вайны, мы не хочам смерцяў людзей, бо загінуць мільёны. Каму гэта патрэбна? Трэба цяпер спыніцца. І гэта ў інтарэсах найперш Еўропы», — адзначыў ён.

> **Для дасягнення міру патрэбен кампраміс. З разлікам на тое, што надыдзе час, народы вызначацца, дзе ім жыць і якую валюту выкарыстоўваць. «Народы! Толькі не трэба ім перашкаджаць. Але, зноў жа, гэта вырашаецца за сталом перагавораў», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.**

Журналісты спыталі, ці будзе ён настойваць на прысутнасці Беларусі за гэтым сталом перагавораў. Прэзідэнт адказаў станоўча і растлумачыў сваю пазіцыю. Найперш адзначыў, што тут няма ніякіх асабістых амбіцый, як гэта часта прадстаўляюць. Тут два ключавыя пытанні: нацыянальныя інтарэсы і бяспека ў рэгіёне.

У Прэзідэнта пацікавіліся яго меркаваннем наконт магчымай міратворчай місіі краін Захаду, каб ахоўваць граніцы ў выпадку дасягнення перамір'я ва Украіне. Аляксандр Лукашэнка адказаў, што найлепшым варыянтам для гэтага былі б беларускія міратворцы. «Але, каб вы разумелі, я туды не рвуся і, хутчэй за ўсё, я сваіх людзей (на сёння) туды не збіраюся адпраўляць — міратворцаў. Не збіраюся. Але беларусы толькі могуць забяспечыць паміж сярэднім і старэйшым братам нармальныя ўзаемаадносіны», — удакладніў ён.

> **Прэзідэнт адзначыў, што гатовы да любога развіцця падзей на беларуска-ўкраінскай граніцы. «Мне ўсё роўна, каго яны паставяць па той бок граніцы. Крок налева, крок направа за межы дзяржаўнай граніцы — вы ведаеце нашу рэакцыю», — заявіў ён.**

На сёння беларуска-ўкраінская граніца застаецца закрытай наглуха. Прапановы беларускага боку адкрыць яе не знаходзяць падтрымкі з боку суседзяў. Аднак, як расказаў Аляксандр Лукашэнка, беларусы і ўкраінцы падтрымліваюць пэўныя кантакты. У прыватнасці, Беларусь дапамагае Расіі і Украіне ў абмене ваеннапалоннымі. У Беларусі толькі ў мінулым годзе прынялі амаль 300 тысяч бежанцаў з Украіны. «Да «агрэсара» прыбылі. Дапамагаем ім», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Частка ўкраінцаў далей з'язджае ў Польшчу, частка — у Расію, некаторыя і ў Беларусі. «Вось вам дом, вось вам трактар, камбайн, завод, фабрыка — ідзіце працуйце. Вашым дзецям — бясплатную адукацыю, бясплатную ахову здароўя, у дзіцячы садок і іншае, і іншае. Вось такое наша стаўленне да ўкраінцаў, калі яны да нас прыязджаюць жыць. Да ўсіх», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы згадаў адну з нядаўніх заяў Уладзіміра Зяленскага, што ён хацеў міру, а Прэзідэнт Беларусі нібыта прапаноўваў нанесці ўдар па Мазырскім НПЗ. «Слухайце, калі я гэта пачуў, мне стала дрэнна. Для мяне абсалютна было непрымальна — прапанаваць Зяленскаму нанесці ўдар па нашым НПЗ. Па самым лепшым, я б сказаў, у свеце заводзе, які мы нядаўна мадэрнізавалі, уклаўшы туды вялізныя сродкі. Клянуся вам, што такога не было. Ну навошта ты гэта кажаш? Ты кепскі шоўмен, ты нават не Трамп. Хлусіш!» — адрэагаваў на гэта ён.

Беларускі лідар перакананы, што ўкраінскі народ чакае цяжкі лёс, калі яны не вызначацца са сваім лідарам і ўладай і не зразумеюць, што ім трэба аднавіць краіну самім. Таксама, па яго словах, дапамогуць ім у гэтым толькі суседзі, не Захад.

## АБ СІТУАЦЫІ Ў МАЛДОВЕ: «ВАЗЬМІЦЕ ГАЛАВУ Ў РУКІ І ПАЧЫНАЙЦЕ АДСТОЙВАЦЬ КРАІНУ»

Журналісты з Малдовы спыталі ў Аляксандра Лукашэнкі, якой ён бачыць будучыню іх краіны. Найперш беларускі лідар прызнаўся, што вельмі цёпла ставіцца да гэтай краіны. Па яго словах, у Малдовы ёсць усё, каб квітнець. Але трэба мабілізавацца, знайсці шляхі аб'яднання краіны, захаваць яе суверэнітэт і ні ў якім разе не ламаць тую сістэму, якая ўжо выбудавана. «Вазьміце галаву ў рукі і пачынайце адстойваць краіну. Лічыце, што ёсць нейкі разбураны фундамент, і паціху пачынайце яе выбудоўваць. Вопыт ёсць. Хочаце дапамогі — калі ласка, можам дапамагчы, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Я не кажу, што вы павінны пайсці нашым шляхам ці ў наш бок. Але навошта вы ламаеце тое, што стварылі? Я чалавек эвалюцыйнага развіцця. Давайце з таго, што ёсць, вырастайце як дзяржава (а яна ёсць у вас, суверэнная) або на Захад ці на Усход. Але толькі не ламайце тое, што ёсць».

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што Малдове патрэбна моцная ўлада, здольная мабілізаваць народ і дамаўляцца, дзе толькі можа. Ён параіў таксама ні ў якім разе не абапірацца на тых, хто патрабуе нейкай ломкі. Па словах беларускага лідара, Малдова можа дасягнуць дамоўленасцяў і з Расіяй, і з Захадам, але рабіць гэта трэба выключна з пазіцыі ўласных, нацыянальных інтарэсаў.

## АБ КРЫЎДАХ АРМЕНІІ: «Я ЗАЎСЁДЫ ПАДТРЫМЛІВАЎ ЦВЯРОЗЫ РОЗУМ»

«Яны пачалі падлашчвацца да ЕС. Небяспечная гульня. Супакойце яго там. Ён знішчыць Арменію. У яго праблема з аднаго боку — з усходу, у яго праблема з захаду. Ён яшчэ і Расію настройвае супраць сябе. Ён у акружэнні, невялікая тэрыторыя. Насельніцтва не гіганцкае. І ён атачыў сябе ворагамі. Вось, Еўрасаюз пачне яму там нечым дапамагаць... Яму што, незразумела, што адбылося ва Украіне?» — выказаўся Аляксандр Лукашэнка аб кіраўніцтве Арменіі, размаўляючы з прадстаўніком гэтай краіны. Ён успомніў, што армянскія калегі пакрыўджаны на Беларусь за падтрымку Азербайджана. «Гасподзь з вамі, я заўсёды падтрымліваў цвярозы розум, быў за тое, каб не было вайны, каб мы не біліся адзін з адным», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў, што некалі фактычна выконваў пасрэдніцкую функцыю паміж лідарамі Азербайджана і Арменіі, спрабуючы паспрыяць мірнаму вырашэнню тэрытарыяльнай спрэчкі. Беларускі лідар расказаў, што тады яго азербайджанскі калега Ільхам Аліеў займаў прагматычную пазіцыю, прапаноўваў эканамічнае супрацоўніцтва і інвестыцыі і не меў мэты ваяваць з Арменіяй. Але армянскі бок такі падыход не падтрымаў. «Ваяваць пачалі. Я пры чым тут? Мы за тысячы кіламетраў жывём. Я, ці што, гэту вайну развязаў? Тое, што адбылося, вынікі гэтых бітваў — віна кіраўніцтва ў Арменіі. Толькі віна», — абурыўся Прэзідэнт. «Але пытанне не ўва мне і Беларусі. Яны вырашылі, кіраўніцтва Арменіі, «стрэліць» у мяне, але ведаеце, у каго яны хацелі трапіць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Разам з тым Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што, як і раней, вельмі добра ставіцца да армянскага народа.

## АБ ПАМЫЛКАХ УЛАДЫ ЛІТВЫ: «ВОСЬ І СТРАЦІЛІ СВАЮ КРАІНУ»

Пагаварылі і пра блізкіх суседзяў. Прэзідэнт нагадаў, што калісьці беларусы марылі жыць так, як прыбалтыйскія рэспублікі. «У савецкія часы — «пад акупацыяй», як яны кажуць, — яны дасягнулі такіх вышынь! Я бываў у Літве. Людзі ў чарзе стаялі, каб купіць тэхніку, прадукты харчавання з Літвы», — згадаў ён. А сёння, звярнуў увагу беларускі лідар, пад уплывам дэмакратыі Літву фактычна знішчылі. А тым часам Літва праводзіць супраць Беларусі жорсткую палітыку: закрывае граніцы, закрывае свае парты для беларускіх грузаў. «Мы цярпліва ставімся да гэтага. Мы стварылі для літоўцаў і латышоў бязвіз, адкрылі граніцы — яны сваіх людзей палохаюць, што мы іх тут будзем вербаваць. Ды бог з вамі! У нас завербавана дастаткова літоўцаў, не трэба нам нікога вербаваць. Не, «вось будуць вербаваць» і гэтак далей. Такое глупства!» — заявіў беларускі лідар. Ён падкрэсліў, што сёння Літва з'яўляецца марыянеткай Еўрапейскага саюза. «Вось і страцілі сваю краіну. Ёй пальцам пакажа Еўрапейскі саюз, Брусель — будзе рабіць, таму што яны сядзяць на грашах гэтага Бруселя. А не дай бог амерыканцы нешта скажуць — яны бягом бягуць рабіць», — сказаў ён.

## АБ АДНОСІНАХ З ПОЛЬШЧАЙ: «ДАВАЙЦЕ СУПРАЦОЎНІЧАЦЬ РАЗАМ»

Польскі журналіст спытаў у Прэзідэнта, якімі ён бачыць далейшыя адносіны Беларусі і Польшчы. Але, перш чым казаць пра адносіны, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што сёння Польшча праводзіць супраць Беларусі самую агрэсіўную і дрэнную палітыку. «Я нічога не прыдумляю. Мы — вашы суседзі, мы шмат гадоў жылі ў адной дзяржаве. Дрэнна, добра... Вы сёння прэтэндуеце на Заходнюю Беларусь да Мінска, пра Заходнюю Украіну пачалі ўжо гаварыць. Навошта вам гэта імперства? Вы ж разумееце, што вы ў нас нават метра тэрыторыі не атрымаеце. У нас жывуць палякі, але гэта мае палякі. Таму ў вас нейкія пасылы дзікія ідуць, калі вы спрабуеце абгрунтаваць тую ці іншую тэндэнцыю ў вашай палітыцы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што беларусы заўсёды былі сябрамі для палякаў і хочуць жыць у сяброўстве. Але гэта жаданне не ўзаемнае.

Беларускі лідар нагадаў, што менавіта Польшча па камандзе Еўрасаюза і ЗША ўвяла супраць Беларусі санкцыі, нягледзячы на цесныя бізнес-кантакты з польскімі прадпрымальнікамі. Ён нагадаў, што ў 2020-м з польскага боку ішло не проста прамое ўмяшанне ў выбарчы працэс, але і з тэрыторыі Польшчы накіроўваліся спробы разваліць краіну. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што палякі пабудавалі на граніцы з Беларуссю сцяну нібыта для абароны ад мігрантаў. Пры гэтым, звярнуў увагу ён, праз Беларусь у ЕС ідзе толькі малая доля мігрантаў ад агульнага патоку. «Поўная карупцыя, хлусня. Ведаеце, колькі трэба часу мігрантам, каб пераадолець вашу сцяну? 10 хвілін — пад, 15 хвілін — цераз. А яны ж плацяць прыстойныя грошы вашым там, хто ахоўвае граніцу», — прывёў яшчэ адзін факт кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларусы да палякаў ставяцца па-чалавечы, як да суседзяў. Па яго словах, Польшча талерантная, добрая, цудоўная краіна. «Чаму вы на нас глядзіце праз ствол гарматы ці праз прыцэл аўтамата? Мы не збіраемся на вас нападаць. Навошта? Мы ж не зможам вас перамагчы. Але і вы павінны ведаць, што вы нас не пераможаце ніколі. Нават калі б у нас не было Расіі, ядзернай зброі, яшчэ нечага», — сказаў ён. Беларускі лідар папярэдзіў, што палякі не змогуць увесь час сябраваць з Амерыкай, і прывёў у прыклад Украіну. Таму, па яго словах, варта аднавіць сяброўскія адносіны з суседзямі. «Калі вы хочаце, каб было добра, — здымайце санкцыі, давайце супрацоўнічаць разам», — заклікаў Аляксандр Лукашэнка.

> **«У вас няпростая сітуацыя. Вы там пасварыліся з немцамі, ёсць вельмі сур'ёзныя праблемы. І з намі. Вы што, на два франты «ваяваць» хочаце? Вы гатовы зайсці ў Заходнюю Украіну. Паспрабуйце толькі. Будзеце мець тады справу і з Беларуссю, і з Расіяй. Не трэба лезці ва Украіну», — праз прадстаўніка іх тэлеканала перасцярог суседзяў беларускі лідар.**

У той час як Прэзідэнт Беларусі выступаў за аднаўленне адносін з палякамі, у медыяполі з'явілася заява міністра замежных спраў Польшчы Радаслава Сікорскага наконт непрызнання выбараў у Беларусі, якую агучыла прэс-сакратар Прэзідэнта Наталля Эйсмант. У гэтай заяве гаварылася ў тым ліку і аб «агрэсіі Расіі» і расійскім лідары.

«Навошта вы чапляеце Расію? Навошта вы Пуціна тузаеце? Ну што, у вас праблем не хапае? Сікорскі ж — дасведчаны чалавек. Мы з ім сустракаліся, размаўлялі. Чаго яму няймецца наконт нашых выбараў? Ён няхай думае, што будзе заўтра. Сёння гноем закідалі Міністэрства замежных спраў польскія сяляне. А заўтра? Таму супакойцеся. Мы пра вас нешта кажам? Не!» — адрэагаваў на гэта Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу, што ў Польшчы ў маі гэтага года свае выбары. «Але мы не будзем у іх умешвацца. А калі хочаце, можам паказаць, што мы нешта ўмеем. Са штучным інтэлектам, IT-тэхналогіямі і іншым. Але мы такой мэты не ставім. Нам гэта не трэба. Мы не жадаем гэтай эскалацыі», — сказаў беларускі лідар.

«Сікорскаму чыркані, няхай свой нос не суне, куды яго не просяць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да польскага журналіста.

## АБ ДЫЯЛОГУ З ЗАХАДАМ: «У ЕЎРОПЫ АДЗІН ШЛЯХ — ПРАВОДЗІЦЬ СВАЮ ПАЛІТЫКУ»

У Прэзідэнта спыталі, ці гатовы ён аднавіць дыялог з Захадам. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што беларускі бок ніколі ад гэтага не адмаўляўся. Ён падкрэсліў, што Еўрапейскі саюз — магутнае аб'яднанне, якое мае тэхналагічную эканоміку і моцную валюту. Там пражывае каля 450 мільёнаў чалавек, што значна больш, чым у ЗША.

> **«У Еўропы адзін шлях, разумны шлях — праводзіць сваю палітыку. Грошы ёсць, тэхналогіі ёсць. Патрэбны рэсурсы. Яны тут, на беларуска-расійскай прасторы. Яны ў Расіі. Дамоўцеся з Расіяй. Яны ж вам гатовы прыродны газ танней прадаваць, нафту таннейшую. І калі з Расіяй дамовіцца, — якая Амерыка, нават Кітай не справіцца з гэтым аб'яднаннем», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.**

«Чаму гэта не адбываецца? Гэта ж можна зрабіць, я гавару вам як Прэзідэнт. Як беларусы кажуць, «духу не хапае». Няма каму прыняць такое рашэнне. Але гэта іх выбар. Час усё расставіць на свае месцы».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота БелТА.**

---

**Меркаванні**

## «ТАКІХ АДКРЫТЫХ ПРЭЗІДЭНТАЎ ВЕЛЬМІ МАЛА»

### Чым замежным журналістам запомнілася прэс-канферэнцыя Аляксандра Лукашэнкі

Беларускія журналісты да адкрытасці і разгорнутых адказаў кіраўніка дзяржавы ў цэлым прывыклі. А вось для некаторых замежных журналістаў такая размова з Прэзідэнтам у навінку. Пацікавіліся ў калег іх уражаннямі ад вялікай прэс-канферэнцыі Аляксандра Лукашэнкі.

«Гэта цікавы фармат. Я раней глядзеў шмат выступленняў Аляксандра Лукашэнкі. Гэта мая першая сустрэча з ім ужывую. І, вядома, мне было цікава ўбачыць беларускага Прэзідэнта. Адзначу, што ён выступае вельмі энергічна. Мне спадабалася, што ён кажа тое, што хоча сказаць, нічога не ўтойвае. Прэс-канферэнцыя была доўгая, але насычаная і цікавая. Прэзідэнт удзяліў шмат часу журналістам, за што яму вялікі дзякуй. Я не магу сказаць, ці задаволены я адказамі Аляксандра Лукашэнкі, гэта яго думкі. І дзякуй, што ён імі падзяліўся. Наша задача — перадаць гэта сваёй аўдыторыі», — падзяліўся журналіст з Фінляндыі, **карэспандэнт «Іелейс Радыё» Хэйкі Хейсканен.** У цэлым, па яго словах, у іх няма ніякіх праблем з работай у Беларусі.

**Карэспандэнт «Бі-бі-сі» Стыў Розенберг** расказаў, што шмат выбараў бачыў, але беларусы яго здзівілі. «Я такога не ўспомню, каб у асноўны дзень выбараў адбылася больш як чатырохгадзінная прэс-канферэнцыя аднаго з кандыдатаў у прамым эфіры. Я рады, што меў магчымасць задаць свае пытанні Прэзідэнту Беларусі і ён на іх падрабязна адказаў», — сказаў ён. Стыў Розенберг расказаў, што размаўляў і з іншымі кандыдатамі і гэта таксама было цікава.

**Журналіст кітайскага агенцтва «Сіньхуа» Чэнь Цін** згадаў сваю першую сустрэчу з Прэзідэнтам Беларусі на чэмпіянаце па колцы дроў сярод СМІ. Па яго словах, гэта было вельмі незвычайна. «Як карэспандэнт я таксама рабіў рэпартаж з выбарчага ўчастка. Усё ціха, спакойна, людзі прыходзяць як на свята, — падзяліўся ён. — Сёння Аляксандр Лукашэнка вельмі адкрыта адказаў на ўсе пытанні, у тым ліку вострыя. Такіх адкрытых Прэзідэнтаў вельмі мала».

«Заходнія медыя ўбілі ў галаву, што добра там, а тут дрэнна. Гэта насамрэч абсалютная хлусня. Нам падмяняюць каштоўнасці. Нас спрабуюць падмануць і павесці па няправільным шляху. Сёння, на вялікі жаль, Арменія, Малдова па гэтым шляху ідуць. Беларусі ўдалося гэтага пазбегнуць у 2020 годзе, інакш бы, магчыма, увогуле не існавала б такой краіны», — адзначыў **Мікаэл Бадалян, блогер з Арменіі,** у эфіры тэлеканала «Першы інфармацыйны».

**Бразільскі журналіст Лукас Лейрас** у эфіры «Першага інфармацыйнага» заўважыў, што Беларусь — вельмі адкрытая краіна, але на Захадзе меркаванне ўжо сфарміравана і іншае яны чуць не хочуць. «Бачым некаторых заходніх журналістаў, якія спрабуюць зладзіць правакацыі. Гэта ўжо занадта. На жаль, у Еўропе схільны казаць пра Беларусь у негатыўным ключы. Ім папросту гэта выгадна. Насамрэч гэта адкрытая дэмакратычная краіна», — сказаў ён.

**Валерыя СЦЯЦКО.**